Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 58 (127)
ПАНЯДЗЕЛАК
11
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СКРОМНАСЦЬ УПРЫГОЖВАЕ БОЛЬШЭВІКА

У прамове на вечары крэмлёўскіх курсантаў (28 студзеня 1924 года), прысвечаным памяці Леніна, таварыш Сталін расказаў аб сваёй першай сустрэчы з Владзімірам Ільічом, якая адбылася на большэвіцкай канферэнцыі ў Тамерфорсе.

«Прынята, што «вялікі чалавек» звычайна павінен спазняцца на сходы, з тым, каб члены схода з заміраннем сэрца чакалі яго з'яўлення, прычым перад з'яўленнем вялікага чалавека члены схода папярэджваюць: «тсс... цішэй... ён ідзе». Гэта абраднасць здавалася мне не лішняй, бо яна імпаніруе, унушае павагу. Якое-ж было маё расчараванне, калі я даведаўся, што Ленін з'явіўся на сход раней за дэлегатаў і, забіўшыся недзе ў кутку, па-прасцецку вядзе гутарку, самую звычайную гутарку з самымі звычайнымі дэлегатамі канферэнцыі. Не ўтаю, што гэта паказалася мне тады некаторым нарушэннем некаторых неабходных правіл.

Толькі потым я зразумеў, што гэта прастата і скромнасць Леніна, гэта імкненне астацца непрыкметным або, ва ўсякім выпадку, не кідацца ў вочы і не падкрэсліваць сваё высокае становішча, — гэта рыса прадстаўляе адзін з самых моцных бакоў Леніна, як новага правадыра новых мас, простых і звычайных мас найглыбейшых «нізоў» чалавецтва.

Ва ўспамінах таварыша Сталіна, у яго прамовах і характарыстыках паўстае жывы вобраз Леніна. Ленін — найвялікшы геній, правадыр, мысліцель. Але і тады, калі ён жыў і працаваў разам з намі, і зараз, калі Леніна няма ў жывых, калі яго вобраз астаўся ў нашай памяці, у нашай свядомасці, — Ільіч з'яўляецца ўвасабленнем прастаты і скромнасці. Такім-жа правадыром з'яўляецца таварыш Сталін. У таварышу Сталіне наш народ бачыць, цэніць і любіць тыя-ж самыя рысы. Ленінска-сталінскі стыль намі ўспрымаецца як ідэальная норма паводзін большэвіка.

Сапраўднаму ленінцу, сапраўднаму сталінцу глыбока чужды малейшае самамненне, малейшая поза, параднасць, шуміха. З якім гневам і страсцю абрушваўся наш Ленін на высокамерных і чванлівых людзей. Якой забойчай і трапнай іроніяй б'е наш Сталін лакіраваных комуністаў, самазадаволеных бюракратаў, вяльмож, пампадураў! І, наадварот, з якой любоўю, цеплынёй і павагай наш правадыр гаворыць аб сапраўдных большэвіках — партыйных і беспартыйных, аб простых і звычайных людзях, якія без шуму і трэску працуюць для агульнага дабра, будуюць комунізм, нясуць у сваёй асобе рысы новага чалавека, новай, соцыялістычнай маралі!

Патрабаванні гэтай маралі партыя прад'яўляе кожнаму свайму члену, незалежна ад яго службовага становішча. Перад тварам гэтых патрабаванняў усе роўныя ў большэвіцкім асяроддзі, глыбока дэмакратычным па свайму статуту і сваёй прыродзе. З жалезных правіл статута, правіл нашай партыйнай маралі няма выключэнняў ні для радавых членаў партыі, ні для яе адказных работнікаў. Натуральна, зразумела і законна тая патрабавальнасць, з якой ускрываюцца і крытыкуюцца памылкі і недахопы асобных кіруючых работнікаў на праходзячых зараз партыйных канферэнцыях.

У крытыцы на справаздачна-выбарчых сходах і на партыйных канферэнцыях комуністы прад'яўляюць высокія патрабаванні да сваіх кіруючых работнікаў, зыходзячыя з сталінскай характарыстыкі тыпу партыйнага работніка. Прастата і скромнасць павінны быць арганічнай рысай кожнага партработніка. Гэта глыбока ўсвоена кадрамі партыі.

На жаль, у нас яшчэ не выveліся людзі іншай складкі. У нас яшчэ ёсць любіцеліараднай шуміхі, пустапарожніх рапартаў, аглушальных апладысментаў, эфектных поз і становішчаў, ёсць ахвотнікі да елею і лаўраў. Кіраўнікі партыйнай арганізацыі украінскага аддзялення «Саюзсярэдмаш» (Харкаў) напярэдадні справаздачна-выбарчага партыйнага схода склікалі ў сваёй установе шырокі мітынг. Мітынгу было рэкамендавана выдзеліць дэлегацыю для таго, каб ад імені супрацоўнікаў вітаць партыйны справаздачна-выбарчы сход. Адкуль такая ахвота да лаўраў, тым больш, што практыка кіраўнікоў гэтай установы далёка не такая ідэальная, каб упрыгожваць іх вянкамі?

У Кеменскім раёне (Кіргізская ССР) да абслугоўвання раённага справаздачна-выбарчага схода райком прыцягнуў струнны аркестр. Члены прэзідыума схода займалі месцы пад пераможны туш. У ролі музыкантаў на партыйным сходзе выступалі вучні сярэдняй школы.

Тыповы прыклад грубага нарушэння партыйнай скромнасці меў месца ў Іванаве ў снежні 1939 года. Абласная газета «Рабочий край» надрукавала, з дазволу сказаць, нарыс-фельетон пад назвай «Сын народа», у якім праўзнасіліся да нябёс вартасці тагочаснага другога сакратара абкома партыі тав. Кузняцова. Гэты «літаратурны партрэт» напісан пяром яўнага падхаліма. Нічым непрымячальныя ўчынкі Кузняцова газета паказвала як ледзь ці не геройскія подвігі. Вось узор стылю, якім напісан «нарыс» аб Кузняцове:

«Работа яго складаная і велізарная. Амаль штодзённа, далёка за поўнач, можна бачыць агонь у яго кабінеце. Там сядзіць ён за рабочым сталом, або стаіць ля абшырнай карты Іванаўскай абласці. Бегае ўказка па велізарнай карце, спыняючыся на патрэбных месцах. Сакратар зорка глядзіць на карту і робіць у блакноце кароткія заўвагі».

У падхалімскім парыванні аўтар фельетона і рэдактар газеты прысвоілі Кузняцову званне першага сакратара абкома, якім ён не з'яўляўся і не меркаваўся. Цэнтральны Камітэт ВКП(б) прызнаў недапушчальным для большэвіцкай газеты факт апублікавання гэтага саладжава-падхалімскага, пошлага фельетона. Рэдактара газеты тав. Кудраўцава, які дапусціў надрукаванне фельетона, і супрацоўніка газеты тав. Курбатава, які напісаў фельетон, ЦК ВКП(б) зняў з работы. Адначасова ЦК ВКП(б) паставіў на від бюро Іванаўскага абкома, што яно не рэагавала на змяшчэнне ў газеце «Рабочий край» падобнага фельетона.

Партыя патрабуе ад кожнага свайго работніка строгіх адносін да сябе. Паменш позы, паменш параднасці і шуміхі! Высокі аўтарытэт большэвіка-кіраўніка ў масах, але аўтарытэт гэты ствараецца беззаветнай работай у славу справы Леніна—Сталіна, высокай прынцыповасцю кіраўніка і яго строгай дзелавітасцю.

Не фон упрыгожвае чалавека і не поза надае яму аўтарытэт. А ў нас ёсць і такія кіраўнікі, якія не гавораць з людзьмі інакш, як павучаючым, рэзонерскім тонам. Такія кіраўнікі ігнарыруюць вопыт мас, думку, ініцыятыву, якая ідзе знізу. «Вы нас не вучыце, без вас ведаем, што рабіць!». Такі высокамерна-барскі вокрык дазволіў сабе тав. Хмялёў, адзін з сакратароў Бронніцкага райкома партыі (Маскоўская абласць) па адрасу сельскіх комуністаў, якія звярнуліся да свайго райкома з дзелавой парадай.

На партыйнай канферэнцыі Ленінскага раёна Масквы ішла гутарка аб адставанні станказавода імені Орджанікідзе. Адной з прычын гэтага адставання з'яўляецца дрэнная якасць — зазнайства. Завод у свой час атрымаў ад урада ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга. Гэта ўскружыла галовы дырэктару тав. Ошараву і сакратару парткома тав. Петухову. Завод перажыў на сабе вынікі такога галавакружэння: знізіліся тэмпы і якасць работы, павысіліся брак і цякучасць рабочай сілы, аслабла партыйна-палітычная работа, аслабла ўвага да людзей, да стаханаўцаў.

Скромнасць упрыгожвае большэвіка. Гэтыя словы таварыша Сталіна з'яўляюцца дэвізам для кожнага члена партыі. У адным радзе з патрабаваннямі бязмежнай адданасці справе партыі, свяшчэннай нянавісці да яе ворагаў, з патрабаваннямі палітычнай прынцыповасці стаіць і патрабаванне маральнай чыстаты, прастаты і скромнасці, — гэтых абавязковых якасцей комуніста.

(Перадавы артыкул «Правды» за 6 сакавіка).

ПАВЕЛ АНТОНАВІЧ СЯЎКО
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР па выбарчай акрузе № 601.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Сяўко з маладымі выбаршчыкамі

Валкавыск, 9 сакавіка (па тэлефону). У гарадскім тэатры адбылася сустрэча маладых выбаршчыкаў горада Валкавыска са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза ССР Паўлам Антонавічам Сяўко.

Больш 500 маладых выбаршчыкаў, якія першы раз у сваім жыцці будуць галасаваць за народных дэпутатаў, з вялікай радасцю слухалі прамову свайго кандыдата.

— Я сын селяніна-бедняка. Сялянства наша ў былой панскай Польшчы жыло, як вы самі ведаеце, у вельмі цяжкіх умовах. Працоўнае насельніцтва не ўдзельнічала ў грамадскім жыцці краіны.

Я даю слова, што давер'е народа апраўдаю з чэсцю, не пашкадую свайго жыцця за справу працоўных. Я буду чэсна выконваць усе ўказанні партыі, совецкага ўрада і асабіста друга і бацькі народаў таварыша Сталіна.

Выступіўшыя маладыя выбаршчыкі тт. Рубіна, Петэр, Гандэнберг і іншыя расказалі аб бяспраўі моладзі ў былой панскай Польшчы. Яны на канкрэтных фактах гаварылі аб тых вялікіх клопатах з боку большэвіцкай партыі і ўрада, якія яны адчуваюць, і заклікалі ўсю моладзь 601 выбарчай акругі прыйсці ўсім як аднаму 24 сакавіка на выбарчыя ўчасткі і аддаць свае галасы за народных кандыдатаў.

Сход прыняў зварот да ўсіх маладых выбаршчыкаў 601 выбарчай акругі.

Авілаў.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты тав. Гершмана з выбаршчыкамі

Каля 600 чалавек—выбаршчыкаў вёсак Каракулі, Агароднікі, Новадворцы, Субляны, Бачанаўка і Цяснае 9 сакавіка сабраліся на мітынг, прысвечаны сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Гершманам Грыгорыем Майсеевічам.

Мітынг адкрыў старшыня Беластоцкага РВК тав. Акуліч. Ён прадастаўляе слова тав. Гершману. У сваёй прамове ён сказаў:

—Таварышы-выбаршчыкі! Дазвольце вітаць вас, вызваленых з-пад гнёту памешчыкаў і капіталістаў, з новым, шчаслівым радасным жыццём.

Панская Польшча была мачыхай для працоўных беларусаў, яўрэяў і палякаў. Памешчыкі, фабрыканты, ксяндзы і папы высмактвалі з рабочага і селяніна пот і кроў. Масціцкія і бекі ніздольны былі займацца пытаннем паляпшэння матэрыяльнага становішча працоўных.

Совецкі ўрад узяў пад абарону працоўных заходніх абласцей Украіны і БССР. З першых дзён совецкай улады сялянскія гаспадаркі Беластоцкай абласці атрымалі 180,5 тысяч дзесяцін зямлі. У абласці створана 193 новых школы, арганізавана 40 дзіцячых садоў, 26 новых бальніц. Дзесяткі тысяч беспрацоўных атрымалі работу.

Выбаршчыкі вашай акругі аказваюць мне вялікае давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. З'яўляючыся членам большэвіцкай партыі, ваша давер'е я аднашу нашай вялікай партыі Леніна–Сталіна. Я як член партыі і выбраннік народа прыкладу ўсе свае намаганні на рост і ўмацаванне нашай радзімы, на паляпшэнне матэрыяльнага становішча працоўных.

* * *

Выступаючыя на мітынгу тт. Драздоўскі, Пшэбыляк і іншыя заклікалі прысутных у дзень выбараў аддаць свае галасы за тав. Гершмана Грыгорыя Майсеевіча.

Д. Кавлоў.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

ВЯЧЭСЛАВУ МІХАЙЛАВІЧУ МОЛАТАВУ

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Беластоцкі гарадскі камітэт комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі горача віншуе Вас, вернага вучня Леніна, бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, друга працоўных—са слаўным пяцідзесяцігоддзем.

Уся наша неабсяжная краіна, народы вялікай соцыялістычнай радзімы з пачуццём вялікай урачыстасці адзначаюць пяцідзесяцігоддзе з дня Вашага нараджэння, таму што ўсё сваё свядомае жыццё Вы аддалі справе партыі Леніна—Сталіна, справе рабочага класа і ўсіх працоўных.

Вы былі вярнейшым вучнем Леніна і бліжэйшым саратнікам вялікага Сталіна ў барацьбе за стварэнне большэвіцкай партыі, за дыктатуру пролетарыята. Вы разам з Леніным і Сталіным прывялі нашу партыю, рабочы клас і ўсіх працоўных да сусветна-гістарычнай перамогі. Вы разам з таварышам Сталіным адстаялі вучэнне Маркса—Энгельса—Леніна — Сталіна ад подлых пігмеяў капіталізма—трацкістаў, бухарынцаў і іншых падонкаў чалавечага грамадства.

У годы грамадзянскай вайны, у годы індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны Вы разам з Леніным і Сталіным вялі народы Совецкага Саюза па ленінска-сталінскаму шляху ад перамогі да перамогі. Вы прывялі совецкую дзяржаву да сусветна-гістарычнай перамогі, да соцыялізма.

СССР стаў магутнай індустрыяльнай дзяржавай, непрыступнай крэпасцю соцыялізма. Пад Вашым кіраўніцтвам узнялося на сусветную вышыню значэнне совецкай дзяржавы і міжнародны аўтарытэт СССР.

Працоўныя Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі з любоўю ў сэрцах вымаўляюць Ваша імя і ніколі не забудуць Вашай гістарычнай прамовы, сказанай 17 верасня 1939 года па радыё аб вызваленні іх з-пад гнёту польскіх капіталістаў і памешчыкаў.

Мы, большэвікі горада Беластока, абяцаем Вам, што будзем штодзённа выхоўваць у сабе тыя якасці большэвіка нашай вялікай партыі Леніна-Сталіна, узорам увасаблення якіх з'яўляецеся Вы, таварыш Молатаў.

Мы завяраем наш Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна, што выканаем з чэсцю ўскладзеныя на нас партыяй і ўрадам задачы.

У дзень пяцідзесяцігоддзя, у дзень слаўнай даты Вашага вялікага жыцця шлём Вам сардэчнае віншаванне і жадаем доўгіх год жыцця на радасць і шчасце працоўнага чалавецтва.

Беластоцкі гарком КП(б) Б.

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 9 сакавіка на фронце не адбылося нічога істотнага. У Выбаргскім заліве нашы часці занялі востраў **Паркаан-саары** і на заходнім беразе гэтага заліва мястэчкі **Карпіла і Рухеля,** а на паўночным усходзе ад Выбарга занялі мястэчка **Рэпола** на чыгунцы Выбарг—Сердаболь.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. Пры гэтым збіта 5 самалётаў праціўніка.

АДКРЫЦЦЁ НАВІГАЦЫІ НА ПАЎДНЁВЫХ РЭКАХ

Масква, 10 сакавіка. (ТАСС). На паўднёвых рэках пачалася навігацыя. Першыя параходы прайшлі па Аму-Дар'і, Сыр-Дар'і, Ілі і Кубані. На Дняпры навігацыя аткрыта паміж Херсонам і Кахоўкай і на ўчастку Запарожжа — Тарасаўка. Са сканчэннем ледаходу пасажырскія судны пойдуць ад Кіева да Пінска.

24 САКАВІКА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР і БССР

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 374 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Нікалай Іванавіч Грыбаедаў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Нікалай Іванавіч Грыбаедаў перайшоў былую польскую граніцу сумесна з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі. Перайшоў па заданню партыі для таго, каб разам з другімі комуністамі дапамагчы працоўным Заходняй Беларусі пазбавіцца ад панскага прыгнёту, падняць жыццё вызваленага народа да жыццёвага ўзроўню совецкага народа.

Праз дзве-тры гадзіны пасля першых Варашылаўскіх залпаў, ад якіх паны беглі не аглядаючыся, Нікалай Іванавіч ужо быў сярод сялян бліжэйшых вёсак. Тут ён убачыў даўно забыты ў Совецкім Саюзе малюнак: дзеці хадзілі разутымі, у абарванай вопратцы. У полі навакол вузкія загоны...

Нікалай Іванавіч жадаў найхутчэй расправіцца з белапольскай клікай і прыступіць да практычнай работы па аказанню дапамогі беларускай, яўрэйскай і польскай беднаце.

Сваім таварышам у тыя гадзіны ён неаднаразова гаварыў:

— Нашы браты — з намі. Цяпер іх чакае толькі шчасце і радасць. Пры нашай дапамозе вызваленыя Чырвонай Арміяй працоўныя Заходняй Беларусі будуць будаваць і пабудуюць соцыялізм!

Практычная работа, аб якой марыў тав. Грыбаедаў, пачалася праз некалькі дзён. Да 21 верасня былі пройдзены Стаўбцы, Навагрудак, Слонім, Валкавыск. Потым тры дні праведзены ў Гродна, дзе Нікалай Іванавіч, выконваючы абавязкі старшыні часовага ўпраўлення, нямала дапамог Чырвонай Арміі ў справе ачышчэння горада ад польскіх афіцэраў і жандараў. У канцы верасня тав. Грыбаедаў прыбыў на работу ў гор. Саколка. Займаючы пасаду старшыні Саколкаўскага часовага ўпраўлення, ён усе свае сілы, увесь свой вопыт совецкай работы аддае барацьбе за выкананне пастаўленых партыяй задач.

— Пасля ачысткі горада ад панскіх астаткаў, — расказвае тав. Грыбаедаў, — мы разам з мясцовай беднатой узяліся за навядзенне парадку ў зямельных справах. Памешчыцкую зямлю размеркавалі сярод сялян і ў першую чаргу сярод беднаты. Усяго па былому Саколкаўскаму павету перадалі сялянам 10 тысяч гектараў ворыўнай зямлі. Гэтымі 10.000 гектарамі ўладалі раней 72 памешчыкі. Інакш кажучы, 72 памешчыкі мелі зямлі столькі, колькі мелі 4 тысячы сялянскіх двароў...

Вынікі работы тав. Грыбаедава працоўныя Саколкі адчувалі штодзённа. Яны хутка ўпэўніліся, што ён чэсна і добрасумленна служыць народу. Працоўныя Саколкаўскай выбарчай акругі аднадушна абралі яго дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. І тав. Грыбаедаў апраўдаў іх давер'е—ён галасаваў за совецкую ўладу, за партыю Леніна—Сталіна, за шчасце і радасць працоўных.

Нядаўна працоўныя Саколкі вылучылі тав. Грыбаедава Н. І. кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

* * *

Цікава і павучальна біяграфія Нікалая Іванавіча Грыбаедава.

Нарадзіўся ён у 1898 годзе ў сям'і беларуса-батрака вёскі Масюкі, Аршанскага раёна, Віцебскай вобласці. Яго бацька Іван Матвеевіч да 1909 года быў батраком. Батрачыць, працаваць на памешчыкаў у маёнтках Турплева і Белікі прыходзілася і пасля куплі трох дзесяцін зямлі, таму што сям'я складалася з 10 душ.

Жыццё працякала бязрадасна, пры выключна цяжкіх матэрыяльных умовах. Яно стала проста невыносным, калі бацьку прызвалі на імперыялістычную вайну. У гэтыя годы да пачатку Кастрычніцкай рэволюцыі гаспадаром у сям'і з'яўляўся, як старэйшы з дзяцей, Нікалай Іванавіч.

5 лютага 1917 года ў старую армію быў прызван і Н. І. Грыбаедаў. Але доўга не служыў. Хутка старая армія была дэмабілізавана. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ўладу ў свае рукі ўзяў пролетарыят. Звярнуўшыся дамоў, Нікалай Іванавіч у студзені 1918 года неадкладна паступіў дабравольцам у Чырвоную Армію. З дня стварэння Чырвонай Арміі ён застаецца ў яе радах, дзе служыць у горадзе Смаленску. Спачатку радавым чырвонаармейцам, а потым камандзірам узвода, камандзірам роты.

За ваенную справу ў радах Чырвонай Арміі тав. Грыбаедаў узяўся з вялікім жаданнем. Ён к гэтаму моманту ўжо дастаткова разумеў, што совецкі ўрад і яго Чырвоная Армія служаць працоўнаму народу.

У 1919 годзе тав. Грыбаедаў дабравольна накіроўваецца на фронт для рашучай барацьбы супроць Юдзеніча. Удзельнічаў у баях пад Ленінградам, камандаваў ротай і батальёнам.

Шмат цяжкасцей давялося сустрэць на фронце. Вораг, адчуваючы сваю смерць, хапаўся за малейшую магчымасць, каб прарваць фронт. Полк, у якім быў тав. Грыбаедаў, каля ракі Нарвы аказаўся акружаным. Азвярэўшае афіцар'ё пагражала слаўным чырвоным байцам палка крывавай расправай. Але цвёрдасці і мужнасці большэвіцкіх воінаў ворагу зламаць не ўдалося. Змяніўшы геройска загінуўшых камандзіраў палка, тав. Грыбаедаў і яго таварышы сваім умелым камандаваннем змаглі прарваць акружэнне ворага і злучыліся з ішоўшым падмацаваннем. Банда Юдзеніча была разгромлена.

Пасля ліквідацыі фронта Нікалай Іванавіч працягвае службу ў РСЧА: у Смаленску камандуе ротай, у Оршы — камендант горада. Звальняецца з арміі толькі ў 1922 годзе па хваробе.

Зноў тая-ж родная вёска Масюкі. Але выглядзіць яна ўжо не так, як раней. Бедната атрымала зямлю. Бацька Нікалая Іванавіча дадаткова атрымаў 5 гектараў; у іх гаспадарцы ўпершыню паявіўся конь, дзве каровы, пабудавалі дом. Сяляне любоўна сустрэлі свайго земляка—выхаванца Чырвонай Арміі Нікалая Іванавіча. Яны тут-жа абралі яго членам сельсовета і старшынёй сялянскага камітэта ўзаемадапамогі. З 1924 па 1927 год тав. Грыбаедаў працуе ў сельсовеце ў якасці старшыні. З 1927 года ён член ВКП(б).

Адданую, добрасумленную працу Нікалая Іванавіча аценілі і раённыя арганізацыі. У 1927 годзе яго вылучаюць на раённую кіруючую работу — загадчыкам райфінаддзела. З 1930 па верасень 1939 года, на працягу амаль дзесяцігоддзя, ён з'яўляецца старшынёй райвыканкома: 5 месяцаў у сваім раёне, далей у Крупскім, Клічаўскім, Кармянскім і Будакашалёўскім раёнах. З лютага 1940 года ён працуе ў Беластоку намеснікам старшыні абласнога выканаўчага камітэта.

Дзе не быў тав. Грыбаедаў,— усюды ён апраўдваў давер'е народа, давер'е партыі Леніна—Сталіна. Гэтае давер'е Нікалай Іванавіч Грыбаедаў апраўдае перад сваімі выбаршчыкамі і будучы дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

В. Даям'янаў.

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 350 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Міхаіл Нікалаевіч Тупіцын

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

У сяле Суроўка, Куйбышэўскай вобласці, у 1906 г. нарадзіўся Міхаіл Нікалаевіч Тупіцын. У сям'і было 9 душ, а зямлі — паўтары дзесяціны. Жылі ўпрогаладзь. Бацька, каб пракарміць сям'ю, хадзіў на промыслы, часта за 200—300 кілометраў. Быў лесарубам, краўцом, плотнікам. Міхаіл Нікалаевіч працаваў дома ў гаспадарцы і адначасова вучыўся ў школе, але не змог яе скончыць. Трэба было здабываць хлеб, і ён пашоў на заработкі.

У 1922 г. Міхаіл Нікалаевіч першым у сяле ўступіў у комсамол, стаў арганізатарам моладзі.

У 1925 г. ён паступіў на вучобу ў педагагічны тэхнікум гор. Ульянаўска. Вучыўся добра. Вучачыся, ён прымаў актыўны ўдзел у грамадскай рабоце ў тэхнікуме, быў сакратаром калектыва комсамола, членам бюро гаркома комсамола.

1929 год — год вялікага пералому, год калектывізацыі. Кулацтва люта супраціўлялася. Як лепшага комсамольца-актывіста, акруговы камітэт комсамола накіраваў тав. Тупіцына на работу ў вёску. Тут ён смела, як сапраўдны большэвік, удзельнічае ў рашэнні складаных пытанняў работы ў вёсцы.

У тым-жа годзе тав. Тупіцына прызвалі ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Служба яго праходзіла ў Сярэдняй Азіі. У радах Чырвонай Арміі Міхаіл Нікалаевіч уступіў у партыю большэвікоў.

Пасля службы ў Чырвонай Арміі Міхаіл Нікалаевіч працуе дырэктарам сярэдняй школы, а затым дырэктарам ірыгацыйна-будаўнічага тэхнікума ва Узбекскай рэспубліцы. Тав. Тупіцын праводзіць вялікую работу па падрыхтоўцы мясцовых нацыянальных кадраў. Ён арганізаваў спецыяльны набор на падрыхтоўчае аддзяленне тэхнікума, абучаў студэнтаў-узбекаў рускай мове, дапамагаў ім авалодваць ведамі.

1930—31 годы—годы масавага ўступлення дэхкан у калгасы. Тав. Тупіцын актыўна ўдзельнічае ў гэтай вялікай і складанай справе. У далёкіх кішлаках ён праводзіць вялікую масава-растлумачальную работу сярод дэхкан, заклікае іх весці барацьбу з баямі — мясцовымі кулакамі. Сярод насельніцтва далёкіх кішлакоў Міхаіл Нікалаевіч заваяваў аўтарытэт чэснага большэвіка-ленінца.

У 1932 г. Наркомцяжпром накіраваў тав. Тупіцына дырэктарам Клінцоўскага тэхнікума. Затым ён працуе ў Маскве ў Галоўэнерга. З 1933 г. тав. Тупіцын на партыйнай рабоце спачатку на хіміка-фармацэўтычным заводзе, потым на абутковай фабрыцы «Парыжская комуна», затым інструктарам Кіраўскага райкома ВКП(б) гор. Масквы. Ён вядзе вялікую прапагандысцкую работу — кіруе гурткамі, чытае лекцыі на прадпрыемствах, у клубах, карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод рабочых за чулыя, уважлівыя адносіны да людзей.

Працуючы, ён адначасова вучыўся, павышаў свой ідэйна-тэарэтычны ўзровень. Без адрыву ад вытворчасці Міхаіл Нікалаевіч скончыў курсы марксізма-ленінізма пры ЦК ВКП(б), займаўся ў інстытуце Чырвонай Прафесуры.

У кастрычніку 1937 г. тав. Тупіцына накіроўваюць на работу ў Беларускую ССР, дзе ён працуе спачатку ў апараце ЦК, а затым сакратаром Сталінскага райкома КП(б)Б гор. Мінска.

У 1939 г. Міхаіл Нікалаевіч працаваў у органах НКВД начальнікам Палескага абласнога ўпраўлення. Працоўныя Палескай вобласці аказалі вялікае давер'е тав. Тупіцыну, выбраўшы яго дэпутатам абласнога совета. Зараз тав. Тупіцын працуе сакратаром гаркома КП(б)Б у гор. Беластоку. Працоўныя Беластока вылучылі я о кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Увесь жыццёвы шлях Міхаіла Нікалаевіча Тупіцына — гэта шлях чэснага, самаадданага служэння совецкаму народу, справе партыі Леніна — Сталіна, якая ўзрасціла і выхавала яго. Яго жыццё служыць яркім паказчыкам таго, як з гушчы народных мас партыяй большэвікоў і совецкай уладай узрошчваюцца і выхоўваюцца дзяржаўныя работнікі.

Е. Данская.

ШЫРОКІ РАЗМАХ ПЕРАДВЫБАРЧАЙ АГІТАЦЫІ

Працоўныя горада Друскенікі з вялікім палітычным уздымам рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Яны праяўляюць надзвычайны інтарэс да вывучэння самых дэмакратычных у свеце законаў — Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. Для задаволення запросаў выбаршчыкаў у горадзе створан агітацыйны калектыў у ліку 40 чалавек, якім кіруе тав. Глаз. Большасць агітатараў—гэта таварышы з мясцовага беспартыйнага актыва.

Агітацыйная работа праводзіцца ў гуртках і дома ў выбаршчыкаў. Рэгулярна два разы ў тыдзень працуюць 20 гурткоў; імі ахоплена больш 1000 чалавек. З выбаршчыкамі, якія не могуць наведваць гурткі, заняткі праводзяцца індывідуальна дома.

Агітацыйным калектывам праведзены гутаркі па асобных тэмах: аб міжнародным становішчы, гераічных подвігах Чырвонай Арміі ў барацьбе з фінскай белагвардзейшчынай, аб поспехах краіны Советаў і інш. Да гэтых гутарак насельніцтва праявіла вялікі інтарэс.

Вельмі жыва і цікава праводзяць заняткі агітатары тт. Эскін, Найдзін, Цынас, Ціхоцкі. Яны выкарыстоўваюць наглядныя дапаможнікі—геаграфічную карту, плакаты, табліцы.

Агіткалектывам створан гурток мастацкай самадзейнасці з 50 чалавек. Гурток выступае перад выбаршчыкамі са спевамі, дэкламацыямі і іншай мастацкай самадзейнасцю.

Выбарчыя ўчасткі сталі сапраўднымі цэнтрамі агітацыйна-масавай работы. Яны добра абсталяваны і ўпрыгожаны. На ўчастку заўсёды выбаршчык можа атрымаць даведку, кансультацыю, пачытаць газету, літаратуру. Кожны выбарчы ўчастак за дзень наведвае больш 85 выбаршчыкаў. Рэгулярна, раз у пяцідзёнку, выпушчаюцца насценныя газеты.

Выбаршчыкі горада Друскенікі аднадушна заяўляюць, што яны ў дзень выбараў — 24 сакавіка ўсе, як адзін, з'явяцца на выбарчыя ўчасткі і аддадуць свае галасы за кандыдатаў непераможнага блока комуністаў і беспартыйных

П. М. Налівайка,

загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Парэцкага РК КП(б)Б.

Узорна падрыхтуемся да першай совецкай вясны

НА ВЫЗВАЛЕНАЙ ЗЯМЛІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАВАЁВАН БАГАТЫ ЎРАДЖАЙ

АРГАНІЗАВАЦЬ АЧЫСТКУ НАСЕННЯ

Сяляне вёсак Бельскага раёна рыхтуюцца ва ўсе ўзбраенні сустрэць першую совецкую вясну.

2 сакавіка прэзідыум райвыканкома зарэгістраваў статут першай у раёне сельскагаспадарчай арцелі ім. Сталіна, арганізаванай у вёсцы Кнарыды з 35 бядняцкіх і батрацкіх гаспадарак. Больш 100 сялянскіх гаспадарак вёсак Аўгустова, Гацькі і Плюцічы таксама выказалі жаданне аб'еднацца ў сельскагаспадарчую арцель, каб сустрэць першую совецкую вясну калектыўнай працай на вызваленай зямлі.

У мэтах арганізацыі работы ў кузнях і паскарэння рамонту інвентару райком партыі і райвыканком днямі правялі раённую нараду кавалёў. На нарадзе, абмеркаваўшы пытанне падрыхтоўкі да сяўбы, кавалі прынялі на сябе абавязацельствы актыўна дапамагаць бядняцкім гаспадаркам у рамонце інвентара.

Зараз у раёне праходзяць курсы сялянскага актыва. На курсах абучаецца 60 чалавек сялянскай моладзі. Гэта — будучыя брыгадзіры калгасаў. Іх паслалі вучыцца галоўным чынам тыя вёскі, у якіх налічваецца па некалькі дзесяткаў гаспадарак, жадаючых арганізаваць калгас.

У раёне налічваецца многа сялянскіх гаспадарак, якія не маюць коней. Сельсоветы правялі вялікую растлумачальную работу сярод сялян, якія маюць коней, з тым, каб яны дапамаглі бясконным гаспадаркам у час веснавых палявых работ. Сяляне з задавальненнем адгукаюцца на гэта мерапрыемства.

Аднак трэба адзначыць, што райземаддзел да гэтага часу пасапраўднаму не ўзначаліў кіраўніцтва падрыхтоўкай да вясны. За работай зернаачышчальных абозаў не ўстаноўлен кантроль. У раёне створана 9 абозаў, але як яны працуюць—ні старшы аграном, ні загадчык райза дакладна не ведаюць. У рэзультаце план ачысткі насення па былых маёнтках выканан толькі на 50 проц., а сялянскімі гаспадаркамі ачышчана не больш 20 проц.

Зусім слаба праходзіць абмалот. На 1 сакавіка ў раёне заставалася яшчэ многа неабмалочанага зярна. У некаторых вёсках абмалот затрымліваецца з прычыны адсутнасці паліва для лакамабіляў. Так, напрыклад, у вёсцы Кнарыды ўжо больш тыдня не праводзіцца малацьба толькі таму, што няма дроў для паравой малатарні. Сельсовет не прымае ніякіх мер, каб забяспечыць лакамабіль дрывамі.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы павінна праходзіць больш арганізавана. Для гэтай мэты неабходна поўнасцю скарыстаць палітычны і вытворчы ўздым працоўных, выкліканы падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Л. Федасенка.

У г. Валкавыску арганізаваны курсы трактарыстаў для пяці раёнаў Беластоцкай вобласці. На курсы запісаліся 170 чалавек.

На здымку: Першая лекцыя на курсах трактарыстаў. Справа лектар тав. Пісарэнка. (Фота Сапір),

У БЕЛАСТОЦКІМ РАЁНЕ ДРЭННА РЫХТУЮЦЦА ДА СЯЎБЫ

Набліжаецца першая совецкая вясна. Працоўнае сялянства, вызваленае назаўсёды з-пад ярма памешчыкаў, мірасдаў-асаднікаў і кулакоў, будзе праводзіць вясеннюю сяўбу. Забяспечыць узорную падрыхтоўку да сяўбы яравых — важнейшая задача партыйных і совецкіх органаў.

Правядзенне перадвыбарчай работы ў Беластоцкім раёне да апошняга часу не спалучана з баявой падрыхтоўкай да сяўбы. Ні ў адным з былых памешчыцкіх маёнткаў раёна не закончан абмалот зерневых. У раёне нібы арганізавана 6 зернаачышчальных пунктаў. Але што робіцца на гэтых пунктах, невядома. Нават сам загадчык райза тав. Петрушэнка не ведае, што канкрэтна зроблена ў раёне па ачыстцы насення.

Да рамонту сель кагаспадарчага інвентару ў раёне амаль не прыступалі. Раней райза нібы меркаваў арганізаваць кузні, але меркаванні так і засталіся меркаваннямі. Ні адна з такіх кузняў у раёне не функцыяніруе. Райсаюзам завезена 17 тон плужных адвалаў, лемяхоў, шын для калёс і іншага жалеза, але яно не рэалізуецца сярод сялян.

На складзе райсаюза ляжыць 2.688 цэнтнераў розных мінеральных угнаенняў. Здавалася-б, што іх патрэбна было-б даўно адправіць у кожнае сельпо раёна, згодна разнарадкі. Між тым, з 9 сельпо, якія маюцца ў раёне, толькі Тыкацінскае прыступіла да адгрузкі ўгнаення.

Атсутнасць штодзённай большэвіцкай работы сярод насельніцтва па падрыхтоўцы да сяўбы ў раёне выкарыстоўваюць варожыя элементы. У вёсцы Студзенка кулацкі падпявала Гімік Юльян, былы капрал польскай арміі, Кардзінскі Сяргей, Кардзінскі Іван і Высоцкі Іван праводзяць антысовецкую работу. Былы эканом маёнтка Стальмахова сістэматычна агітуе батракоў не атрымліваць зямлі, інвентару і жывёлы з маёнтка таму, што, моў, скора звернецца пан.

Дарэмны надзеі лакеяў польскіх магнатаў і панскіх служак на зварот мінулага! Струхнелы панскі лад знішчан назаўсёды. У гэтым упэўнена ўся маса працоўных заходніх абласцей БССР. Батракі, беднякі і сераднякі з утроенай энергіяй актыўна ўдзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве. І ніякія спробы ворагаў не могуць стрымаць пабеданоснага шэсця ўперад. Усё-ж пашкодзіць ворагі могуць там, дзе аслаблена класавая пільнасць.

Разгарнуўшы большэвіцкую работу сярод насельніцтва, неабходна забяспечыць узорную падрыхтоўку да сяўбы.

Д. Казлоў

ДЗЁННІК ДАВЕРАНАГА

Улік работы, праводзімай на выбарчым участку, дапамагае даверанаму ведаць свае слабыя месцы, а значыць, і ліквідаваць іх. Працуючы давераным, я раблю заўсёды кароткія запісы ўсяго таго, што праводзіцца на ўчастку.

За апошні час на 84 выбарчым участку праведзены тры нарады агітатараў. На іх абмяркоўваліся пытанні ўдакладнення спіскаў выбаршчыкаў, прымацавання агітатараў да асобных вуліц і дамоў. Заслуханы інфармацыі аб праробленай агітатарамі рабоце. Абмяркована соцумова з 87 выбарчым участкам.

Асноўную ўвагу мы аддаём індывідуальнай і групавой агітацыі сярод выбаршчыкаў. Агітатары на ўчастку працуюць у асноўным добра. Яны рэгулярна праводзяць заняткі. Слухачы прыходзяць на іх з ахвотай. Прыкладна працуюць агітатары Раманчэнка, Рыба, Цукерман і асабліва член выбарчай камісіі Кавальчук.

Старыкі выбаршчыкі, як, напрыклад, 66-гадовы Кавальскі, 84-гадовы Каган, 58-гадовая Яноўская і іншыя, актыўна наведваюць гурткі. У часы гутарак на занятках яны заўсёды задаюць агітатарам многа пытанняў.

На ўчастку ёсць і дрэнныя агітатары. Так, Майсеенка, Патапаў і Іваноў усяго адзін раз былі на ўчастку. Іх прышлося замяніць, каб не дапусціць паслаблення работы. Не праводзяць работы агітатары з 18-й школы.

На нашым участку мелі месца варожыя вылазкі. Нейкі Прокш, які пражывае па Совецкай вуліцы, з'явіўся у нецвярозым выглядзе на заняткі гуртка па Маліноўскай вуліцы і спрабаваў працягнуць варожыя погляды. Агітатар тав. Раманчэнка* даў яму жорсткі адпор. Выбаршчыкі падтрымалі агітатара.

Ніжэй прыводжу некаторыя запісы з дзённіка, якія адлюстроўваюць масавую работу на выбарчым участку:

18 лютага. На ўчастку быў праведзен вечар жанчын. Прысутнічала 200 чалавек. Яны слухалі даклад аб выбарчай кампаніі. Пасля даклада мастацкімі сіламі Н-скай часці быў дан канцэрт.

23 лютага. Праведзен вечар, прысвечаны XXII гадавіне Чырвонай Арміі. Прысутнічала 250 чалавек. Пасля даклада аб Чырвонай Арміі вучні 18-й школы далі для выбаршчыкаў выдатны канцэрт.

26 лютага. Адбыўся вечар хатніх гаспадынь усяго выбарчага ўчастка. Прысутнічала 200 чалавек. Пасля даклада аб Сталінскай Канстытуцыі сіламі Н-скай часці быў наладжан канцэрт.

29 лютага. З уздымам прайшоў на ўчастку вечар моладзі. Прысутнічала 300 чалавек. Даклад аб міжнародным становішчы зрабіў тав. Іларыёнаў. Вечар закончыўся мастацкай часткай, наладжанай Домам народнай творчасці.

3 сакавіка. Адбыўся вечар, прысвечаны азнаямленню выбаршчыкаў з біяграфіямі кандыдатаў. Зал школы быў перапоўнен, прысутнічала больш 400 чалавек. Закончыўся вечар вялікім канцэртам ансамбля песні і пляскі Н-скай часці.

5 сакавіка. На вечары выбаршчыкаў быў прачытан даклад: «Перспектывы развіцця тэкстыльнай прамысловасці Беластока». Прысутнічала 180 выбаршчыкаў. Яны задавалі многа пытанняў дакладчыку. Вечар прайшоў з уздымам.

І. Біскін,
давераны 84-га ўчастка.

Калгаснікі дружна ўзяліся за работу

Пра калгас у вёсцы Пенькі, Заблудаўскага раёна, пачалі пагаварваць, як толькі прачыталі ў газетах і кнігах пра жыццё калгаснікаў у Совецкім Саюзе.

— Вёска наша бедная. Каб хутчэй пазбавіцца ад жабрацкага жыцця, нам трэба арганізавацца ў калгас,—гаварылі сяляне.

Член валаснога камітэта Іван Ігнацьевіч Азябла заўсёды насіў пры сабе прыкладны статут сельгасарцелі. Да яго прыходзілі аднавяскоўцы, прасілі прачытаць статут. Іван Ігнацьевіч задавальняў іх просьбы. Ён чытаў ім статут сельскагаспадарчай арцелі.

Беднякі пісалі заявы, пасылалі сваіх хадакоў у райком партыі з просьбай дапамагчы ім арганізаваць калгас. Пасля вывучэння статута, сяляне рашылі арганізаваць у вёсцы сельскагаспадарчую арцель. Зараз у вёсцы Пенькі арганізаван калгас ім. Молатава. Старшынёй калгаса выбран тав. Дзмітрук Іосіф.

Калгаснікі дружна ўзяліся за падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Зараз у калгасе распачат рамонт сельскагаспадарчага інвентару, падрыхтоўваецца насенне.

В. Міхайлоўскі

ПАДРЫХТАВАЛІ НАСЕННЕ, РЫХТУЮЦЬ ІНВЕНТАР

У вёсках Гродненскага раёна разгорнута падрыхтоўка да першай совецкай вясны. Добра рыхтуюцца да веснавой сяўбы батракі былога маёнтка Жэрноўка. Тут поўнасцю закончаны абмалот і ачыстка насення. Батракі былога маёнтка Свіслач поўнасцю засыпалі насенныя фонды ачышчаным зярном. Зараз арганізаван рамонт сельскагаспадарчага інвентара. У Індурскім сельсовеце ў сувязі з падрыхтоўкай да вясны арганізаваны 3 зернаачышчальныя пункты.

У раёне працуюць каля 100 кузняў. Работа ў кузнях ідзе бесперабойна. Добра арганізаваў работу ў кузні каваль вёскі Чэшчаўляны т. Адамовіч Сяргей. Рамантаваць сельскагаспадарчы інвентар прывозяць сюды сяляне з навакольных вёсак.

В. Гарбанёў

Калгас у Лашы

Лаша — невялікая вёска ўбаку ад чыгунак і шасейных дарог, у 30 кіламетрах ад Гродна. Калісьці тут было валасное праўленне, але Лаша — беларускае сяло, і войт палічыў за лепшае перавандраваць адсюль у населеную палякамі Квасоўку. Воласць-жа па-ранейшаму працягвала называцца Лашскай.

Лаша прычыняла польскім уладам нямала клопатаў. Перадавыя сяляне арганізоўвалі тут падпольную комуністычную ячэйку, чыталі Маркса і Леніна, завешаўшы вокны, лавілі па радыё Маскву. Але не ўсе былі з чыстай душой. Знаходзіліся і здраднікі, якія даносілі на сваіх таварышоў паліцыі. Такіх людзей тут называюць канфідэнтамі. Яны разбуралі арганізацыю знутры, і нават самая строгая канспірацыя не магла агарадзіць ячэйку ад правалаў. Падпольшчыкі адпраўляліся ў турмы і канцэнтрацыйныя лагеры, канфідэнты-ж атрымлівалі ўзнагароды і пісарскія пасады, пераходзілі ў каталіцтва, жаніліся на заможных палячках.

Як толькі разнеслася гаворка, што Чырвоная Армія перайшла польскую граніцу, у Лашы стварыўся партызанскі атрад. Не чакаючы прыходу совецкіх войск, партызаны расправіліся з афіцэрамі, паліцэйскімі і асаднікамі. У вёсцы ўтварыўся сялянскі камітэт. Выбары ў Народнае Сабранне яшчэ больш ускалыхнулі актыўнасць мас. Узняліся размовы аб калгасе.

* * *

На адным з сельскіх сходаў, пасля таго, як былі абмяркованы стаяўшыя ў абвестцы дня пытанні, хтосьці заўважыў, што добра было-б арганізаваць калгас. Той, хто сказаў гэта, і сам не чакаў, якое захапленне выкліча яго прапанова.

За 15 мінут у калгас запісалася 96 чалавек.

Пакуль са спіскам ездзілі ў Гродна, пакуль з раёна прыехалі інструктары, прайшло некалькі дзён. Ворагі тым часам не драмалі. Кулак Ільля Тупік хадзіў з хаты ў хату, угаварваць, каб выпісваліся з калгаса. Уступаючым у арцель ён напрарочыў столькі бед, што, слухаючы яго, некаторыя жанчыны нават усплакнулі. Кулак Феадосій Дзюрт аказаўся хітрэй. Ён сказаў, што не супроць калгасаў, але ствараць трэба не адну, а адразу тры арцелі: адну для бедных, другую для серадняков, а трэцюю для заможных. Іначай, моў, няма рахунку.

Андрэй Сахарэвіч раней жыў заможна. Цяпер ён прыбядняецца, але душа ў яго што ні на ёсць кулацкая. Ён настрыг з мінскіх газет заметачкі аб непаладках у асобных калгасах і, чытаючы іх услых, гаварыў:

— Вось бачыце, там ужо 20 год калгасы, а толку мала...

Ініцыятыўная камісія патрабавала, каб кожны, хто жадае ўступіць у калгас, падаў уласнаручную заяву. Такіх заяў паступіла ўсяго 22. У той-жа дзень, калі калгас канчаткова аформіўся, кулак Скробка прадаў спекулянтам адразу двух кароў. Ільля і Міхаіл Тупікі прадалі па каню.

* * *

Першы сход калгаса адбываўся ў школе. Члены калгаса селі разам, а навокал іх абступілі сотні дзве гасцей.

Прачыталі ўслых Статут сельскагаспадарчай арцелі. Кожны раздзел прымалі галасаваннем. Госці ўсё прыбывалі і калі ля дзвярэй узнік шум, старшынствуючы ўстаў, пастукаў алоўкам па стале і сказаў:

— Хвіліначку! Статут чытаюць для калгаснікаў. Калі ласка, цішэй.

Калгаснікам гэта вельмі спадабалася, а гасцей прывяло ў замяшанне. Запанавала цішыня.

Загадчык раённым зямельным аддзелам Смірноў гаварыў не спяшаючыся, проста і пераканаўча:

— Паскарэй трэба пасадзіць рымароў правіць збрую, каваля—лад іць фурманкі. Дабро калгаснае беражыце больш за сваё. А дабра ў вас будзе многа. Адной зямлі колькі! Абагуленая ды плюс 150 гектараў асадніцкай, ды 30 гектараў войта...

З лаўкі ля сцяны падняўся худы чарнявы чалавек з нябрытымі шчокамі. Ён загаварыў перарывіста, хутка, плюшкаючы і пазбягаючы глядзець на людзей:

— Коней не трэба звадзіць разам, няхай астануцца ў кожнага. У агульнай канюшні карміць нявыгадна, — сказаў ён і апусціўся на сваё месца.

— Эх, змяшаў гарох з капустай,—дасадліва махнуў рукой стары Савоська, — тады гэта не калгас будзе.

Той, хто гаварыў гэта, адчуў на сабе выпрабоўваючыя погляды калгаснікаў і апусціў галаву. Здавалася, быццам і выступіў ён не па перакананню, а па нейчай просьбе. Гэта быў Васіль Саваневіч (у вёсцы яго завуць Саланевіч), чалавек працавіты, начытаны, ціхі, крыху хваравіты пасля турмы, куды трапіў за рэволюцыйную дзейнасць. Але зараз ён займаў надзвычайна дзіўную пазіцыю. Калі сталі выбіраць праўленне калгаса, Саланевіч зноў узяў слова, каб адвесці кандыдатуру актывісткі Раісы Габец.

Нехта ў радах аднаасобнікаў захлопаў у далоні. Яго падтрымалі іншыя аднаасобнікі. Тады падняўся Смірноў.

— Таварышы,—сказал ён, — тут зараз некаторыя хлопалі. Гэта яны хлопалі ў здароўе кулака, за смерць калгаса. І ў тым няма нічога дзіўнага, таварышы. Бо вы-ж доўгія годы жылі з аглядкай на кулака, залежалі ад кулака, падначальваліся кулаку. І не кожны з вас можа адразу адчапіцца ад кулацкіх забабонаў. Але час возьме сваё, і той, хто сёння па сваёй несвядомасці радаваўся кулацкім прамовам, той заўтра зразумее, што ён памыляўся...

Зноў апладысменты. На гэты раз рукаплёскалі калгаснікі, а разам з імі і большая частка аднаасобнікаў.

Рыжаваты Якім Сахарэвіч, канцэнтраваны і рашучы, прайшоў наперад і сказаў:

— Саланевіч гаворыць, што кулакоў у нас няма. Брахня! Ёсць кулакі, і яны хочуць зноў загнаць нас у ярмо...

Раісу выбралі ў праўленне аднагалосна. Саланевіча таксама-ж аднадушна правалілі.

* * *

Саланевіч цяжка перажываў свой правал і хадзіў як у ваду апушчаны. Заўважыўшы гэта, прыехаўшыя з горада комуністы выклікалі яго на шчырую гутарку. Саланевіч зразумеў, што ён быў няпраў.

Увечары засядала праўленне. Пасяджэнне было закрытае, але калі Саланевіч прыадчыніў дзверы, яго паклікалі. Ён сарамліва сеў і яшчэ раз спытаў:

— Можа, нельга? Дык я пайду...

Трэба было назначыць кладаўшчыка.

— Справа адказная,—заклапочана працягнуў Антон Салей—старшыня калгаса. Раіса падняла руку:

— Я прапаную Саланевіча...

На другі дзень раніца выдалася цёплая, туманная. Капала з стрэх, пахла талым снегам, спявалі пеўні, крычалі гусі. Калі мы прышлі на калгасную сядзібу, Саланевіч ужо быў там. Ён начыста вымеў хату для ссыпкі зярна, прывёз вагі, знайшоў гіры, намеціў, куды ссыпаць жыта, куды ячмень і авёс.

У вялікім хлеве, які належаў раней асадніку, жанчыны затыкалі саломенымі жгутамі шчыліны, мужчыны гарадзілі станкі для коней. К гэтаму часу высветлілася, што адной канюшні няхопіць. Разлічвалі на 25 коней, а пасля схода было падана яшчэ 10 заяў аб уступленні ў калгас. Значыць, і коней прыбудзе.

У праўленні калгаса Салей размяркоўваў людзей на работы. Раптам да яго падышоў маленькі, непрыкметны чалавек.

— А мне куды?

— Ты-ж не член калгаса.

— Хачу быць.

— А заяву пісаў?

— Не пісаў.

Салей паглядзеў на членаў калгаса. Тыя сцвярджальна кіўнулі галавой.

Калгас разрастаўся.

П. Лідаў
(«Праўда»).

Лаша, Гродненскага раёна,
Беластоцкай вобласці

ЗА РУБЯЖОМ

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

На Наньнін-Цыньчжоускім шасе кітайскія войскі атакавалі японскі атрад колькасцю ў 1.000 чалавек. Агенцтва Сентрал ньюс паведамляе, што ў выніку бою, які прадаўжаўся тры гадзіны, японцы страцілі забітымі і раненымі каля 300 чалавек.

У паўночна-усходняй частцы правінцыі Гуандун японцы пачалі наступленне на Чэнхай (на поўнач ад Сватоу), аднак кітайскія войскі адбілі іх наступленне. Па паведамленню газеты «Домэйбао», 8 сакавіка японскія войскі пры падтрымцы авіяцыі і танкаў занялі Шыці (на востраве Макао).

7 сакавіка японцы высадзілі свой дэсант ў 35 кілометрах на паўночны ўсход ад Гонконга і ў сучасны момант рухаюцца да Шэнчуна (у 30 кілометрах на поўнач ад Гонконга).

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

У паўночнай частцы правінцыі Чжэцзян, у раёне Ханчжоу, японцы прадпрынялі новую карную экспедыцыю па ачыстцы гэтай тэрыторыі ад кітайскіх войск і партызан. Атрады японскіх войск рухаюцца па лініях Ханчжоу—Цзясіе і Ханчжоу—Хучжоу.

У паўночна-усходняй частцы правінцыі Хунань японцы двойчы імкнуліся высадзіць дэсант на ўсходнім беразе возера Дунціху, у 30 кілометрах на поўдзень ад Іочжоу. Страціўшы каля 1.000 чалавек забітымі і раненымі, японскі дэсант вымушан быў адступіць.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

Ва ўсходняй частцы правінцыі Шаньдун кітайскія партызаны атакавалі некалькі японскіх гарнізонаў у раёне Вейсяня. Бой працягваўся 4 гадзіны. У раёне Аньцю (на поўдзень ад Вейсяня) кітайскія партызаны ўзарвалі мост і ў некалькіх месцах разбурылі шасейную дарогу.

10 сакавіка. (ТАСС).

НАРВЕЖСКІЯ СОЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ ЎСТУПАЮЦЬ У КОМУНІСТЫЧНУЮ ПАРТЫЮ

Осло, 10 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе газета «Арбейдэрэн», восем відных членаў нарвежскай соцыял-дэмакратычнай арганізацыі горада Эўе звярнуліся да мясцовай арганізацыі комуністычнай партыі з пісьмом, у якім просяць прыняць іх у рады нарвежскай комуністычнай партыі. Сваё жаданне ўступіць у компартыю яны матывіруюць тым, што дзеянні соцыял-дэмакратычнай партыі супярэчаць інтарэсам працоўных. Пісьмо падпісалі Улап Швейкерт—член муніцыпалітэта горада Эўе, які з'яўляецца таксама прадстаўніком профсаюза гарнякоў, Альфрэд Мусейд—кандыдат у члены муніцыпалітэта, былы кіраўнік арганізацыі соцыял-дэмакратычнага саюза моладзі і інш.

АНГЛІЯ І ІНДЫЯ

Кабул, 10 сакавіка. (ТАСС). Орган англійскіх кругоў у Індыі газета «Сівалк энд мілітэры газет» паведамляе, што ў Індыі ўзмоцнена цыркуліруюць чуткі аб забароне Індыйскага нацыянальнага кангрэса, як легальнай арганізацыі, бо бюро выканкома кангрэса прыняло варожую ў адносінах да Англіі рэзалюцыю. Лічаць, што кангрэс можа быць зборонен яшчэ да яго дзеяння, назначанага на 15 сакавіка. У афіцыяльных англійскіх кругах выражаюць вялікае нездавальненне варожай пазіцыяй, занятай кангрэсам. Газета ўказвае, што калі кангрэсу будзе дазволена скліканць 53 сесію і правесці падрыхтаваную рэзалюцыю, то магчымасць далейшых перагавораў кангрэса з урадам будзе выключана, і ў адносінах да кангрэса будзе прыменен закон «аб ахове Індыі». Газета пагражаюча заяўляе, што для цэнтральнага ўрада не складзе цяжкасці аднавіць «закон і парадак у Індыі».

ПРЫБЫЦЦЁ РЫБЕНТРОПА Ў РЫМ

Лондан, 9 сакавіка. (ТАСС). Рымскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што сёння раніцай у Рым прыбыў германскі міністр замежных спраў Рыбентроп, якога сустрэлі на вакзале італьянскі міністр замежных спраў Чыана і высокапастаўленыя чыноўнікі італьянскага міністэрства замежных спраў. Рыбентроп быў прынят Мусаліні ў прысутнасці Чыана і германскага пасла ў Рыме Мекензена.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

У МОЛАТАЎСКІМ ЭСКАДРОНЕ

У дні святкавання XX гадавіны Першай Коннай арміі на сваім урачыстым сходзе байцы, камандзіры і палітработнікі Н-скай часці звярнуліся да главы савецкага ўрада таварыша Молатава з пісьмом, у якім прасілі яго аказаць ім вялікую чэсць—даць згоду быць іх пачотным казакам. Народны камісар абароны маршал Савецкага Саюза К. Е. Варашылаў у сваім загадзе № 1 ад 4 студзеня 1940 года задаволіў хадайніцтва казакаў.

Вялікую радасць і натхненне выклікала гэта вестка ва ўсім асабовым саставе часці. На мітынгу было прынята пісьмо Вячэславу Міхайлавічу, у якім чырвонаармейцы і камандзіры абяцалі прыкласці ўсе свае сілы, каб выдатнымі паказчыкамі апраўдаць высокую чэсць, аказаную ім бліжэйшым саратнікам вялікага Сталіна.

Загадам па часці таварыш Молатаў быў залічан у састаў другога эскадрона, які тераічна змагаўся з белапалякамі і заняў к канцу мінулага года першае месца ў часці. Эскадрон вызначыў пачотнага казака ў другі ўзвод, у лепшы танкавы экіпаж камандзіра Зашыхіна.

Уся баявая і палітычная вучоба часці ў апошні час была накіравана к таму, каб азнаменаваць 50-годдзе з дня нараджэння іх пачотнага казака новымі поспехамі.

Да XX гадавіны Чырвонай Арміі часць заняла адно з першых месц у вучэнні. Лепшыя вынікі мае другі Молатаўскі эскадрон, агульны бал якога дасягае 4,33. У ім выдатнае становішча матэрыяльнай часткі, беражна адносяцца да зброі, добрая арганізацыя і методыка заняткаў.

...Знаёмімся з гэтым эскадронам. Разам з камандзірам эскадрона старшым лейтэнантам Волкавым і палітруком Тетавым мы ўваходзім у казарму другога ўзвода. Ля самага ўваходу вісіць спісак асабовага саставу. Першым у ім значыцца імя Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

На ўсю сцяну казармы вісіць вялікі лозунг: „Няхай жыве лепшы саратнік таварыша Сталіна, наш пачотны казак В. М. Молатаў!".

Каля вялікага акна з белымі, як снег, цюлевымі фіранкамі выдзяляецца добра запраўлены зялёны ложак. Ля ўзгалоўя яго мы чытаем: „Пачотны казак В. М. Молатаў". На гэтым ложку ляжыць вялікая падушка, закрытая белым пакрывалам, якое з любоўю вышыта жонкамі камандзіраў.

На сцяне ля ложка ў прыгожа афармленай вялікай рамцы прыгожым почаркам ад рукі напісаны асноўныя біяграфічныя даныя Вячэслава Міхайлавіча з яго партрэтам, які нарысаваў казак Ефрэмаў.

Зараз, у сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння таварыша Молатава, ва ўсіх ленінскіх пакоях эскадрона зроблены вялікія шчыты з адлюстраваннем на іх асобных момантаў жыцця, рэволюцыйнай і дзяржаўнай дзейнасці юбіляра. Такая-ж дошка вывешана ў клубе часці.

Ва ўсіх падраздзяленнях палітрукі правялі гутаркі з байцамі, дзе расказалі біяграфію выдатнага кіраўніка савецкага ўрада. У другім эскадроне адбыўся мітынг, прысвечаны юбілею таварыша Молатава. Мітынг паслаў Вячэславу Міхайлавічу прывітанне, у якім гаворыцца:

—„Мы шчаслівы рапартаваць Вам, што эскадрон, у якім Вы лічыцеся пачотным казакам, з'яўляецца вядучым у часці і займае ў ім першае месца.

Ваша імя натхняе нас на тое, каб яшчэ лепш і ўпорней авалодаць вышынямі баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Мы заяўляем Вам, што па першаму закліку заўсёды гатовы выступіць супроць ворага нашай любімай радзімы.

Сваю баявую вучобу мы ўвязваем з палітычным выхаваннем працоўных Заходняй Беларусі. Казакі і камандзіры актыўна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Наш эскадрон вылучыў на гэту работу 12 агітатараў".

Прывітальныя пісьмы свайму юбіляру паслалі байцы і камандзіры другога ўзвода і молатаўскі танкавы экіпаж.

Экіпаж танка ў прывітанні піша:

„Мы, асабовы састаў молатаўскага экіпажа, рапартуем Вам, што ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы ў нас толькі выдатныя і добрыя вынікі. Заяўляем, што наша машына хоць зараз гатова да бою. Яна, як і ў баях за вызваленне працоўных Заходняй Беларусі, у будучых бітвах будзе граміць любога ворага".

К. Васільеў.

Казакі Н-скага эскадрона.

ПА БЕЛАСТОКУ І ОБЛАСЦІ

ТАБАЧНЫЯ ПЛАНТАЦЫІ

Каб забяспечыць поўнасцю табачныя фабрыкі Беластока і Гродна патрэбнай сыравінай, плошча табачных плантацый у заходніх абласцях БССР будзе ў 1940 годзе павялічана з 791 гектараў да 2.700.

У самай Беластоцкай абласці будзе занята пад пасевы табакі 1.900 гектараў (замест 600).

Сялянскія гаспадаркі, якія будуць сеяць табаку, атрымаюць ад «Саюзтабаксыравіны» насенне махоркі.

Сяляне, якія будуць здаваць табаку звыш плана, атрымаюць ад дзяржавы спецыяльныя грашовыя прэмі-надбаўкі.

КАЛГАС «ВОЛЬНАЯ ПРАЦА»

Былыя батракі і беднякі вёскі Мікіціна, якія жорстка эксплаатаваліся памешчыкам Казловым, атрымалі зямлю. Яны сталі сапраўднымі гаспадарамі свайго жыцця. 6 сакавіка ў вёсцы Мікіціна, Монькаўскага раёна, арганізаван калгас «Вольная Праца». У калгас уступіла 29 бядняцкіх і батрацкіх сямей.

Калгаснікі распачалі падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

ЛЯЛЕЧНЫ ТЭАТР

Абласны тэатр лялек, які знаходзіцца ў Гродна, дзейна рыхтуецца да першага выступлення. Новы тэатр пакажа пастаноўку п'есы «Цырк».

Калектыў тэатра прымае ўсе захады, каб прадэманстраваць прам'еру ў знамянальны дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР — 24 сакавіка.

ПЕРАБУДОВА СУВЯЗІ Ў ОБЛАСЦІ

Арганізацыя раённых цэнтраў, сельскіх і пасялковых советаў патрабуе карэннай перабудовы сувязі ў Беластоцкай абласці.

У бягучым годзе будзе праведзена тэлефанізацыя 289 сельсоветаў. У радзе раёнаў будуць створаны радыёвузлы. У сельсоветах будуць арганізаваны 46 новых паштовых агенцтваў.

700 новых паштовых скрынак будуць размешчаны ў сельскіх мясцовасцях.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ АШЧАДНЫЯ КАСЫ

Зараз у абласці адкрыты ўжо 8 раённых ашчадных кас.

На працягу першага квартала 1940 г. ашчадныя касы адкрыюцца ў астатніх раённых цэнтрах.

СУСТРЭЧА ПА БОКСУ НА ПЯРШЫНСТВА БССР.

9 сакавіка ў тэатры «Палас» адбылася сустрэча па боксу паміж камандамі Беластока і Брэста — на пяршынства БССР.

У сустрэчы прымала ўдзел сем пар, з іх адна незалікавага парадку.

Рэзультат сустрэчы — 12—10 у карысць каманды Брэст II.

У лягчэйшай вазе асабліва вызначыўся тав. Салоўскі (Брэст), які ў сустрэчы з Гурэцкім (Беласток) тактычна і правільна правёў увесь бой і выйграў яго.

Проігрыш Беластока тлумачыцца тым, што ён выставіў няпоўную каманду.

РАЁННЫЯ І ГАРАДСКІЯ ПРОМКАМБІНАТЫ

Для лепшага кіраўніцтва прадпрыемствамі мясцовай прамысловасці ў 20 раёнах Беластоцкай абласці будуць арганізаваны райпромкамбінаты, а ў Беластоку, Гродна і Ломжы — гарадскія промкамбінаты.

Прадпрыемствы, якія да гэтага часу кіраваліся аддзеламі мясцовай прамысловасці, будуць перададзены ў вядзенне новых промкамбінатаў.

БАРАЦЬБА СА СПЕКУЛЯЦЫЯЙ

За продаж тавараў першай неабходнасці па спекуляцыйных цэнах арыштаван і аддаецца пад суд гандляр Ф. Я. Матыльскі.

Пры вобыску ў магазіне Матыльскага знойдзена вялікая колькасць схованых тавараў: 339 кг пярловых круп, 231 кг пшанічнай мукі, 180 кг дрожджаў, 10 мяшкоў солі і інш.

СПІСАК

таварышоў, вылучаных Беластоцкім гаркомам КП(б)Б для дакладаў аб 69-й гадавіне Парыжскай комуны.

1) Тэкст. камб. № 1 — Вольфсон—(тэкст. камб. № 1); 2) Тэкст. камб. № 2 —Арлоўскі—(тэкст. каб. № 2); 3) Тэкст. камб. № 3 — Хмельнік — (горхарчгандаль); 4) Тэкст. камб. № 4 — Цабен — (тэкст. камб. № 4); 5) Тэкст. камб. № 5 — Назімаў — (тэкст. камб. № 5); 6) Тэкст. камб. № 6 — Гімпельсон — (тэкст. камб. № 6); 7) Прадз.-ткацк. фабр. № 11— Новагрудскі — (рэд. «Вольная Праца»); 8) Прадз.-ткацк. фабр. № 12— Розеншайн —(рэд. «Вольная Праца»); 9) Прадз.-ткацк. фабр. № 13 — Фіндэр — (аблплан); 10) Прадз.-ткацк. фабр. № 14 — Натансон — (рэд. «Вольная Праца»); 11) Прадз.-ткацк. фабр. № 15 — Гузаў —(фабр. № 15); 12) Прадз.-ткацк. фабр. № 16 —Найдус — (рэд. «Вольная Праца»); 13) Прадз.-ткацк. фабр. № 17 — Эйціна — (фабр. № 17); 14) Прадз.-ткацк. фабр. № 18 — Прусускі — (абком МОПРа); 15) Прадз.-ткацк. фабр. № 19 — Гольцэр — (абком МОПРа); 16) Прадз.-ткацк. фабр. № 20 — Гелер — (абком МОПРа); 17) Прадз.-ткацк. фабр. № 21 — Шлінгер — (аблархіў); 18) Прадз.-ткацк. фабр. № 23 — Лямпэ—(тэкст. трэст); 19) Прадз.-ткацк. фабр. № 24 — Захар'я — (аддз. працы); 20) Прадз.-тэкст. фабр. № 25—Аронскі — (кам. бежанц.); 21) Прадз.-ткацк. фабр. № 26 — Цяўлоўскі — (фабр. № 26); 22) Прадз.-ткацк. фабр. № 27 — Бухтарэвіч — (гарана); 23) Прадз.-ткацк. фабр. № 29 — Фігельман — (Кагіз); 24) Прадз.-ткацк. фабр. № 30 — Русецкі — (гарана); 25) Прадз.-ткацк. фабр. № 31 — Шульман — (рэд. «Беластокер Штэрн»); 26) Прадз.-ткацк. фабр. № 32 — Блюменкранц — (рэд. «Вольная Праца»); 27) Прадз.-ткацк. фабр. № 33 — Сахарава — (тэкст. трэст); 28) Прадз-ткацк. фабр. № 34 — Жураўскі — (трэст сталовых); 29 Скуркамбінаты №№ 1 і 2 — Каплан Р.—(абком МОПРа); 30) Абутк. фабр.— Кліонскі —(абутк. фабр.); 31) Фанерны завод — Шэгалюцін — (фанерны завод); 32 Шкло-завод — Камоцкі—(гарком КСМ); 33) Глазурны завод—Табачынскі — (глаз. зав.)' 34 Ізразцова - плітачны завод — Таборынскі — (ізразц.-пліт. зав.); 35) Чыгуналіцейны завод — Северын — (гарздраў); 36) Цвіковы завод № 1 — Сарокін — (абком КП(б)Б); 37) Цвіковы завод № 2 — Зільберберг — (абком КСМ); 38) Піваварны завод— Суравіцкі — (пів. зав.); 39) Табачная фабр. — Сцепанаў — (Н-ская вайсковая часць); 40) Мясакамб. — Шварц — (абком харчавікоў); 41) фабрыка уцілю — Мірэр—(фабр. № 29); 42) Сход настаўнікаў — Бабчынскі — (педвучылішча)' 43) Абл. упраўленне сувязі — Берман—(гарана); 44) Сход медработнікаў — Верблоўскі — (абком МОПРа); 45) Маслазавод — Данеберг — (маслазавод); 46) Промкаапрацыя — Смоляр — (абком МОПРа); 47) Аблупраўленне міліцыі — Гаравік — (абл. міліцыя); 48 Швейная фабрыка — Крамаш — (саюз швейнікаў); 49) Клуб дзяржгандлю — Крымскі (горхарчгандаль); 50) Клуб тэкстыльшчыкаў — Хахлоў — (гарком КСМ); 51) Горжылупраўленне — Бенінсон — (гар. пракуратура).

Давераныя выбарчых участкаў робяць даклады на сваіх выбарчых участках.

ГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны аблліта № 310.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.